


Deutscher Bundestag

# Вы хочаце папрацаваць у нямецкім парламенце?

Нямецкі Бундэстаг запрашае Вас сумесна з Вольным універсітэтам Берліна, Берлінскім універсітэтам імя Гумбальдта і Тэхнічным універсітэтам Берліна ўздельнічаць у праграме Міжнароднай парламенцкай стыпендыі (IPS) на 5 месяцаў у Берлін.

Праграма IPS прызначана для высокакваліфікаваных і палітычна зацікаўленых маладых жанчын і мужчын, якія маюць намер пасля заканчэння праграмы вярнуцца ў свае родныя краіны, каб актыўна і адказна ўдзельнічаць у пабудове дэмакратычнай будучыні сваіх краін.

Нямецкі Бундэстаг, парламент Нямеччыны, дае магчымасць маладым людзям у часе 15-тыднёвай дзейнасці, працуючы ў аднаго з дэпутатаў Бундэстагу, знаёміцца з нямецкай парламенцкай сістэмай ды з палітычнымі працэсамі прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў, а таксама збіраць практычны досвед у сферы парламенцкай працы.

Стыпендыяты адбіраюцца незалежнай Адборачнай камісіяй Нямецкага Бундэстагу.

Умовы ўдзелу
- беларускае грамадзянства
- скончаная вышэйшая (універсітэцкая) адукацыя
- вельмі добрае веданне нямецкай мовы
- веданне нямецкай палітыкі, грамадства і гісторыі
- узрост менш за 30 год да пачатку ўдзелу ў праграме стыпендыі

Стыпендыя
- 450 € штомесяц
- аплата жытла
- аплата страхавых і камандзіровачных выдаткаў

Заявы на ўдзел прымаюцца да 30 чэрвеня
- Дадатковая інфармацыя на адваротным баку, у Нямецкай амбасадзе ці ў інтэрнэце па адрасе: www.bundestag.de/ips